# НАШЕ НАСЛЕДИЕ

**Новікаў Сяргей Яўгеньевіч**
кандыдат гістарычных навук,
загадчык кафедры гісторыі
і сацыяльных навук

Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт
Мінск, Беларусь
siarhnovikau@gmail.com

## ПАДРЫХТОЎЧЫ ФАКУЛЬТЭТ ДЛЯ ЗАМЕЖНЫХ ГРАМАДЗЯН МІНСКАГА ІНЯЗА: ДА 45-ГОДДЗЯ ЎЗНІКНЕННЯ[1]

У навуковым нарысе аўтар даследуе адну з самых унікальных старонак гісторыі Мінскага іняза (цяперашняга МДЛУ) – першае дзесяцігоддзе працы факультэта рускай мовы для замежных грамадзян, які знаходзіцца напярэдадні свайго 45-гадовага юбілею. За амаль паўстагоддзя прафесійнай дзейнасці выкладчыкі рускай мовы і літаратуры, гісторыі і геаграфіі падрыхтавалі сотні слухачоў – будучых студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі ў БССР і за яе межамі. Гэтыя дасягненні ў жыцці прафесарска-выкладчыцкага калектыву кафедры рускай мовы для замежных грамадзян і іншых кафедраў інстытута былі трывала звязаны з імёнамі першых дэканаў факультэта – У. І. Базарава, А. М. Шаранды, С. А. Шашковай, Е. Ц. Пятрушэнка.

К л ю ч а в ы я  с л о в ы: *45-гадовы юбілей*; *Мінскі іняз*; *падрыхтоўчы факультэт для замежных грамадзян*; *кафедра рускай мовы для замежных грамадзян*; *замежныя слухачы.*

Падрыхтоўчае аддзяленне для замежных грамадзян у Мінскім інязе было створана 17 кастрычніка 1979 года. Першыя 50 слухачоў, залічаныя для навучання рускай мове, з'яўляліся стыпендыятамі грамадскіх арганізацый і дзяржаўных праграм з розных краін Азіі і Афрыкі (Амана – 1, Анголы – 2, Ганы – 4, Гвінеі-Бісаў – 5, Іарданіі – 10, Ірака – 1, ЙАР – 1, Кеніі – 1, Лівана – 1, Малі – 6, Сенегала – 1, Сірыі – 3, Судана – 1, Эфіопіі – 2) [1, Арк. 38].

Кафедра рускай мовы для замежных грамадзян пачала дзейнасць з верасня 1980 года. Яе першым загадчыкам з'яўляўся кандыдат педагагічных навук, дацэнт М. П. Кавалёў. У склад кафедры ўвайшлі 5 выкладчыкаў падрыхтоўчага аддзялення (С. А. Балонава, У. Г. Галаўша, М. П. Кавалёў, М. М. Севасцьянава, Я. Ф. Трысветва), 11 выкладчыкаў, пераведзеных з іншых кафедраў інстытута (Л. Г. Бучынская, С. Б. Варашылава, А. М. Гуртоўцава, Л. Г. Кандзялінскі, А. І. Кліменка, З. Ф. Корнева, Р. М. Ляхновіч, У. М. Пратасеня, Л. А. Рагоўская, А. М. Сенькевіч, С. Р. Чаркесава) і 4 новыя выкладчыкі – Л. В. Базарава,

[1] Аўтар выказвае шчырую падзяку работніку дэканата факультэта рускай мовы для замежных грамадзян МДЛУ А. Л. Цехановіч за інфармацыйную падтрымку.

У. Б. Журавель, Л. І. Маскалева, В. А. Сяргееў. У ліпені 1981 г. прайшлі па конкурсу яшчэ 3 выкладчыкі: 2 выкладчыкі рускай мовы – У. У. Гурыновіч, І. І. Зябліцаў і 1 выкладчык эканамічнай геаграфіі – А. У. Чыж. У выніку вучэбны, вучэбна-метадычны, навуковы і выхаваўчы працэс на факультэце забяспечвалі 23 выкладчыкі, з якіх 1 – кандыдат навук, 7 – старшыя выкладчыкі і 15 – выкладчыкі. Выкладанне гісторыі СССР забяспечвалі 2 выкладчыкі з кафедры гісторыі КПСС (С. П. Кубека, С. Я. Новікаў) [2, Арк. 73].

Вучэбна-метадычную працу ў 1980/81 вучэбным годзе, калі на падрыхтоўчым факультэце ў 16 групах навучалася 109 студэнтаў з 35 краін свету, забяспечвалі дзве метадычныя секцыі: першая займалася арганізацыяй працы, накіраванай на фарміраванне ў студэнтаў моўных навыкаў і ўменняў на аснове лексіка-граматычнага матэрыялу падручніка, а таксама тэкстаў, распрацовак, лабараторных прац, падрыхтаваных выкладчыкамі кафедры (галоўным чынам на матэрыяле актуальных тэм паўсядзённага жыцця); другая займалася распрацоўкай методыкі фарміравання моўных навыкаў і ўменняў на матэрыяле гісторыі СССР, рускай і савецкай літаратуры, эканамічнай геаграфіі СССР [2, Арк. 60].

Значную ўвагу выкладчыкі надавалі самастойнай працы студэнтаў, якая разглядалася ў якасці аднаго з важных аспектаў адаптацыі замежных грамадзян да навучання ў інстытуце і савецкай краіне. Праводзіліся меры, якія садзейнічалі правільнаму планаванню працоўнага часу студэнтаў, захаванню працоўнай дысцыпліны і рацыяналізацыі прыёмаў вучэбнай працы. У час уводна-фанетычнага курса арганізоўвалася дзяжурства і кансультацыі выкладчыкаў у зале праслухоўвання, вызначаўся аб'ём хатніх заданняў па рускай мове, гісторыі СССР, рускай і савецкай літаратуры, эканамічнай геаграфіі СССР. Студэнты забяспечваліся раздатачнымі вучэбнымі матэрыяламі па згаданых прадметах, размножанымі на ратапрынтары інстытута, вучэбнымі дапаможнікамі, неабходнымі для самастойнай працы. Значнае месца ў навучальным працэсе займала індывідуальная праца са студэнтамі, якая праводзілася ў форме дадатковых заняткаў, у выкананні рознага роду індывідуальных заданняў павышанай цяжкасці, накіраваных на іх пераадоленне, працы па інтарэсах і г.д. Кантроль за самастойнай працай ажыццяўляўся як на аўдыторных занятках, так і ў пазааўдыторны час [2, Арк. 64].

Кафедра з самага пачатку сваёй дзейнасці прытрымлівалася пазіцыі аб пэўнай адтэрміноўцы моманту ўключэння студэнтаў у навукова-даследчую работу па прычыне іх моўнай негатоўнасці да такога віду дзейнасці. Пры гэтым кафедра кіравалася падыходам, калі студэнтаў неабходна як мага раней прыцягваць да вучэбна-даследчай працы, паколькі такая праца ў значнай ступені садзейнічае падрыхтоўцы, асабліва філолагаў, да будучага навучання ў іншых ВНУ Савецкага Саюза. Такую выснову кіраўніцтва кафедры рабіла

са спасылкай на багаты назапашаны досвед падрыхтоўчага факультэта Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава і неабходнасці мэтанакіраванага абавязковага правядзення такой працы [2, Арк. 65].

Важным доказам гэтаму можна назваць дзяржбюджэтную навукова-даследчую тэму “Распрацоўка інтэнсіўных метадаў навучання рускай мовы як замежнай на падрыхтоўчым факультэце для замежных студэнтаў (гуманітарны цыкл)”, зацверджаную пратаколам пасяджэння кафедры рускай мовы для замежных грамадзян № 1 ад 29 верасня 1980 года. Былі вызначаны рамкі выканання тэмы: з 1 студзеня 1981 г. да 31 снежня 1983 года. Навуковым кіраўніком прызначаўся кандыдат педагагічных навук М. П. Кавалёў. У пералік адказных выканаўцаў тэмы ўваходзілі два старшыя выкладчыкі – У. Г. Галайша, Р. М. Ляхновіч і 4 выкладчыкі – Л. І. Маскалёва, А. М. Сенькевіч, В. А. Сяргееў, Я. Ф. Трысветава [3, Арк. 1]. Калі ў пачатку выканаўцамі тэмы з’яўляліся 7 выкладчыкаў, дык праз тры гады іх колькасць павялічылася больш чым утрая. У “Акце аб прыёмцы навукова-даследчай работы” ад 13 студзеня 1984 г. адзначалася, што за гэтыя тры гады былі створаны дапаможнікі: Я. Ф. Трысветава, І. І. Зябліцаў, М. П. Кавалёў “Вучэбны дапаможнік па рускай мове для студэнтаў-замежнікаў падрыхтоўчага факультэта (гуманітарны профіль)”; М. П. Кавалёў, С. П. Кубека, А. М. Сенькевіч, Л. А. Рагоўская “Вучэбны дапаможнік па рускай мове для замежных студэнтаў падрыхтоўчага факультэта (на тэкстах па гісторыі СССР)”; Я. Ф. Трысветава “Дапаможнік па практычнай граматыцы рускай мовы падрыхтоўчага факультэта”; А. У. Чыж, П. В. Сарока, Я. Ф. Трысветава, І. І. Зябліцаў “Кніга для чытання па эканамічнай геаграфіі СССР для студэнтаў-замежнікаў падрыхтоўчага факультэта”; У. У. Гурыновіч, У. Б. Журавель, Л. Р. Захарэвіч, М. П. Кавалёў, Л. А. Рагоўская, В. А. Сяргееў “Дапаможнік па ўвядзенні ў спецыяльнасць для студэнтаў-замежнікаў падрыхтоўчага факультэта гуманітарнага профілю”; Р. М. Ляхновіч, У. Г. Галайша “Дапаможнік па навучанні аўдзіраванню”; М. М. Севасцьянава, Л. І. Маскалёва “Дапаможнік па рускай мове на тэкстах рускай мовы і савецкай літаратуры”. Як адзначана ў заключным “Акце аб прыёмцы…”, распрацаваныя методыкі і дапаможнікі былі ўкаранены ў вучэбны працэс на падрыхтоўчым факультэце ў 1982–1984 гг. [4, Арк. 85–86].

Высокі ўзровень выкладання на факультэце дасягаўся шляхам не толькі актыўнага ўдзелу ў навукова-даследчай працы, але і дзякуючы планаваму павышэнню кваліфікацыі і бесперапыннаму комплекснаму ўдасканальванню прафесійнага ўзроўню прафесарска-выкладчыцкага складу кафедры. Так, у 1984/85 навучальным годзе 2 выкладчыкі (У. У. Гурыновіч, І. І. Зябліцаў) закончылі завочнае аддзяленне філалагічнага факультэта Мінскага дзяржаў-

нага педінстытута імя А. М. Горкага; 4 выкладчыкі (А. М. Сенькевіч, Л. А. Рагаўская, Я. Ф. Трысветава, С. Р. Чаркесава) завочна навучаліся на 4 курсе філфака гэтага ж інстытута; 2 выкладчыкі (А. І. Канькоў, А. С. Шлык) толькі пачыналі навучанне на 2 курсе МДПІ імя А. М. Горкага [5, Арк. 35].

З першых гадоў дзейнасці на факультэце вялася мэтанакіраваная праца па падрыхтоўцы спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі, то бок кандыдатаў і дактароў навук. Так, у дакладзе аб выніках дзейнасці факультэта за першыя пяць гадоў адзначалася, што толькі некалькі чалавек (У. У. Гурыновіч, С. М. Лабаценка, С. Я. Новікаў, С. П. Кубека) працуюць над кандыдацкімі дысертацыямі, у той час як на кафедры рускай мовы для замежных грамадзян існуе значны рэзерв маладых і перспектыўных выкладчыкаў. Пры гэтым сам дэкан дэманстраваў яскравы прыклад навуковай дзейнасці – у лютым 1985 г. прадставіў на абмеркаванне доктарскую дысертацыю на саісканне вучонай ступені доктара філалагічных навук. Тэма даследавання гучала наступным чынам: “Параўнальная тыпалогія катэгорыі прыназоўніка (на матэрыяле нямецкай, рускай і беларускай моў)” [6, Арк. 37].

У справаздачы аб працы падрыхтоўчага факультэта для замежных грамадзян за першыя 5 гадоў адзначалася, што за перыяд з кастрычніка 1979 г. па кастрычнік 1984 г. моўную і гуманітарную падрыхтоўку на факультэце атрымалі і працягваюць навучанне ў ВНУ СССР 540 выпускнікоў факультэта з 66 краін свету. Статыстычныя даныя па гадах паказваюць, што колькасць слухачоў факультэта вырасла з 47 у першы год, да 136 праз пяць гадоў. Найбольш буйныя кантынгенты выпускнікоў падрыхтаваны з наступных краін: з В’етнама – 113 чалавек, з Лаоса – 36, Емена – 33, Мадагаскара – 33, Афгагістана – 32, Кіпра – 27, Эфіопіі – 22, Малі – 22, Марока – 20. На новы 1984/85 навучальны год на факультэце займалася 155 чалавек. Найбольш шматлікімі кантынгентамі з’яўляліся: Афганістан – 20 чалавек, Вьетнам – 16, Лаос – 14, КНДР – 10, Марока – 10, Эфіопія – 7, Тайланд – 7, Сірыя – 7, Чад – 6. Усяго зарэгістравана 18 зямляцтваў і арганізацый. На наступны навучальны год гэта колькасць вырасла да 21 зямляцтва і арганізацый з такіх краін свету, як Афганістан (4), В’етнам (15), Гвінея-Бісаў (3), Замбія (3), Індыя (6), ЙАР (3), НДРЙ (8), Кенія (4), Калумбія (3), Конга (3), Лаос (11), Ліван (3), Малі (9), Марока (5), Палесціна (5), Перу (3), Руанда (4), Сірыя (12), Судан (4), Шры-Ланка (3), Эфіопія (3), якія аб’ядноўвалі 119 студэнтаў. За кожным зямляцтвам ці арганізацыяй замежных навучэнцаў быў замацаваны куратар [7, Арк. 58]. Праз два гады колькасць замежных студэнтаў дасягнула рэкорднай лічбы – 180 чалавек, якія прыбылі ў мінскі іняз з 51 краіны свету [8, Арк. 28].

Як адзначалася ў справаздачы дэкана факультэта А. М. Шаранды, нават за 5 гадоў адбыліся істотныя змены ў кадравым складзе. Калі пачыналі працу на падрыхтоўчым аддзяленні 8 выкладчыкаў, дык праз 5 гадоў іх колькасць на кафедры рускай мовы вырасла да 35 выкладчыкаў рускай мовы і літаратуры,

гісторыі СССР і эканамічнай геаграфіі СССР. Галоўнымі напрамкамі працы ПВС заставаліся: 1) навучанне замежных студэнтаў рускай мове і асновам агульнаадукацыйных дысцыплін; 2) знаёмства з савецкай рэчаіснасцю і далучэнне да савецкага вобраза жыцця і мыслення [9, Арк. 1].

У пераліку напрамкаў дзейнасці выкладчыкаў кафедры таксама пад пільнай увагай знаходзілася палітыка-выхаваўчая праца выкладчыкаў са слухачамі падрыхтоўчага факультэта. Літаральна з першых гадоў для замежных студэнтаў арганізоўваліся шматлікія мерапрыемствы культурнага кшталту, напрыклад: наведванне Брэсцкай крэпасці, Валгаграда, Мемарыяльнага комплексу Хатынь, Кургана Славы, Гатава; ускладанне вянкоў да помніка загінулым воінам; наведванне Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчынай вайны, музея Чырвонасцяжнай беларускай ваеннай акругі; удзел у сустрэчах з удзельнікамі баёў за Малую Зямлю Я. Р. Карташовым, ветэранам 513-й дывізіі прафесарам П. І. Копаневым. У інтэрнаце праводзіліся тэматычныя вечарыны: “Лірыка ваенных гадоў”, “Песні пратэсту ў барацьбе за мір”, арганізаваўся прагляд кінафільмаў і наведванне экспазіцыі карцін М. Савіцкага “Лічбы на сэрцы”. Апроч таго, для слухачоў факультэта былі праведзены бяседы “Беларусь партызанская”, “Гэта не павінна паўтарыцца”, “Да Дня Савецкай Арміі і Ваенна-марскога флоту”, а таксама абмеркаванне фільмаў на героіка-патрыятычную тэму ў рамках прагляду фільмаў гарадскога кіналекторыя. Замежныя студэнты наведалі Музей І з’езда РСДРП, Палац піянераў, станцыю юных натуралістаў, сярэднія школы і дзіцячыя сады, выстаўку ВДНГ БССР, маторны, трактары і гадзіннікавы заводы, паліграфічны і камвольны камбінаты, хлебазавод № 5, вытворчае аб’яданне імя Крупскай, калгас “Рассвет” імя К. П. Арлоўскага, саўгас “Светлы шлях” Маладзечанскага раёна і інш. Вялікая праца куратарамі груп і куратарамі зямляцтваў праводзілася на факультэце па інтэрнацыянальным выхаванні замежных студэнтаў. Яны ўдзельнічалі ў святочных дэманстрацыях 7 лістапада і 1 Мая, рэгулярна наведвалі тэатры Мінска, філармонію, цырк, Палац спорту і інш. У пераліку турыстычных аб’ектаў для наведвання замежнымі навучэнцамі з цягам часу з’явіліся экспазіцыі розных музеяў, у тым ліку ў Вязынцы (радзіма Я. Купалы), Міры, Нясвіжы, Адлеры, Кіеве, Маскве, Ленінградзе, Рызе [2, Арк. 69–71; 10, Арк. 8].

Замежныя студэнты з вялікім інтарэсам знаёміліся з сістэмай народнай адукацыі ў СССР, рэформай сярэдняй школы ў БССР, удзельнічалі ў святкаванні Дня ведаў, бяседах у групах, лекцыі “Навука і адукацыя ў СССР”, прымалі удзел у вечарах інтэрнацыянальнай дружбы, экскурсіях ў піянерскія лагеры. Цікава праходзілі пасяджэнні клубаў па інтарэсах: клуба рускай мовы (адк. М. М. Севасцьянава), клуба “Па краінах і кантынентах” (адк. А. У. Чыж), клуба музычнай культуры (адк. С. А. Балонава), дыскусійнага

клуба (адк. С. Я. Новікаў). На факультэце праводзілася вялікая работа па эстэтычным выхаванні студэнтаў. Былі арганізаваны экскурсіі ў Мастацкі музей БССР, Палац мастацтваў, наведванне ўніверсітэта музычнай культуры. Так, толькі ў 1985/86 навучальным годзе 86 студэнтаў факультэта ўдзельнічалі ў кружках мастацкай самадзейнасці (адк. Л. В. Крамко, Т. Б. Мілякова). Самадзейныя артысты прымалі ўдзел у шматлікіх інстытуцкіх і гарадскіх вечарах і канцэртах, выступалі ў саўгасах і калгасах, школах, у МТЦ “Юнацтва”. Рэгулярна праводзіліся на факультэце вечары нацыянальнага строя і конкурсы нацыянальных блюд, а таксама канцэрт самадзейнай творчасці студэнтаў падрыхтоўчага факультэта, прысвечаны 1 мая. Па развіцці мастацкай самадзейнасці факультэт заняў трэцяе месца сярод пераможцаў на гарадскім фестывалі мастацкай творчасці замежных студэнтаў [7, Арк. 62].

У другім семестры 1985/86 навучальнага года кафедра вялікую ўвагу надавала прапагандзе матэрыялаў XXVII з’езда КПСС. Быў распрацаваны план першачарговых мерапрыемстваў па тлумачэнні і вывучэнні матэрыялаў як на вучэбных занятках, так і ў пазааўдыторны час. Выкладчыкамі былі падрыхтаваны метадычныя распрацоўкі і лабараторныя працы па Палітычным дакладзе ЦК КПСС XXVII з’езду Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Матэрыялы “Асноўныя напрамкі эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986–1990 гг.” вывучаліся на занятках па навуковым стылі (складзены 4 метадычныя распрацоўкі). Студэнты былі забяспечаны літаратурай АПН па XXVII з’езду КПСС на замежных мовах. На кафедры быў створаны куток вывучэння матэрыялаў, у кабінеце рускай мовы аформлены стэнд па матэрыялах XXVII з’езда КПСС [7, Арк. 60].

Матэрыялы XXVII з’езда КПСС займалі цэнтральнае месца ў праграме па гісторыі СССР і эканамічнай геаграфіі СССР. Для замежных студэнтаў быў падрыхтаваны спецкурс па гісторыі СССР “Актуальныя пытанні ўнутранай і знешняй палітыкі КПСС і савецкай дзяржавы”. У пазааўдыторнай палітыка-выхаваўчай працы выкарыстоўваліся розныя формы прапаганды матэрыялаў XXVII з’езда КПСС: адзіныя палітдні, палітінфармацыі ў групах, семінары палітычнай вучобы для лідараў секцый зямляцтваў і маладзёжных арганізацый, вечары-сустрэчы замежных навучэнцаў з дэлегатамі з’езда, пасяджэнні дыскусійнага клуба, вечары пытанняў і адказаў і інш. На факультэце былі аформлены некалькі стэндаў па матэрыялах XXVII з’езда КПСС, прызнаныя лепшымі ў інстытуце і Партызанскім раёне г. Мінска [7, Арк. 61].

Важнае месца займала спартыўна-масавая праца сярод замежных студэнтаў. Па нядзелях працаваў клуб выхаднога дня, у рамках якога праводзіліся розныя спартыўныя мерапрыемствы: спаборніцтвы па футболу, валейболу, тэнісу, лыжах, шахматна-шашачныя турніры, крос (адк. П. В. Сарока). Замежныя студэнты факультэта прымалі актыўны ўдзел у гарадскіх спартакіядах па розных відах спорту.

Так, шматгадовая практыка работы калектыву выкладчыкаў і куратараў на факультэце пацвярджала правільнасць адбудовы вучэбна-выхаваўчага працэсу цераз наступныя формы прыцягнення замежных грамадзян да паўсядзённага жыцця ў інстытуце: 1) правядзенне дыспутаў, вечароў пытанняў і адказаў, канферэнцый па актуальных праблемах сучаснасці; 2) выкарыстанне інфармацыйнай праграмы тэлеперадач "Час" у вучэбным працэсе і пазааўдыторнай працы; 3) аператыўнае інфармаванне замежных студэнтаў аб палітычных падзеях у свеце і на іх малой радзіме; 4) выкарыстанне нагляднай агітацыі (стэнды, насценныя газеты, плакаты, палітычная літаратура і інш.); 5) выяўленне светапоглядных пазіцый студэнтаў пры правядзенні з імі індывідуальнай працы, у працэсе правядзення лекцый, бясед, сустрэч "За круглым сталом", а таксама ў працэсе камунікацыі замежных студэнтаў з савецкімі студэнтамі-актывістамі [7, Арк. 63].

У 1989/90 навучальным годзе на факультэце працягвала працу школа маладога выкладчыка, дзейнасць якой забяспечвалі 6 вопытных настаўнікаў – С. Б. Варашылава, У. Г. Галайша, Р. М. Ляхновіч, Т. Б. Мілякова, А. М. Сенькевіч, С. Р. Чаркесава. Яны перадавалі багаты практычны досвед маладым выкладчыкам, у тым ліку: С. П. Барадзіну, А. П. Качаргіну, А. У. Жосу, Г. Ф. Пастушонак, А. І. Новікавай, Л. У. Тамковіч, Н. З. Нарвойш, Н. М. Кабянковай. Практыкавалася ўзаеманаведванне і абмеркаванне заняткаў настаўнікамі і маладымі выкладчыкамі, а таксама заняткаў іншых вопытных калег, у першую чаргу тых выкладчыкаў, хто праходзіў па конкурсу. У час працы школы маладыя выкладчыкі атрымлівалі рабочыя кансультацыі ад настаўнікаў па складанні планаў і правядзенні заняткаў, ладзілі сумесныя выніковыя заняткі па тэмах з аб'яднаннем вучэбных груп студэнтаў, сумесныя пазааўдыторныя мерапрыемствы з выкарыстаннем новых матэрыялаў у вучэбным працэсе. Маладымі выкладчыкамі вывучалася актуальная навукова-метадычная літаратура, рыхтаваліся вучэбныя матэрыялы, метадычныя распрацоўкі, нагляднасць. Яны ўдзельнічалі ў вучэбна-метадычнай працы і ў распрацоўцы навукова-даследчай тэмы "Навучанне размоўнай дзейнасці студэнтаў-замежнікаў падфака з улікам асаблівасцей роднай мовы", выконвалі грамадскія даручэнні, павышалі свой ідэйна-палітычны ўзровень у тэарэтычным семінары "Ленінская ідэйная спадчына і рэвалюцыйная перабудова" [11, Арк. 88–89].

10-гадовы юбілей калектыў кафедры рускай мовы падрыхтоўчага факультэта для замежных грамадзян сустракаў высокімі паказчыкамі і дасягненнямі ў вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай і выхаваўчай працы са студэнтамі. У параўнанні з першым наборам, у 1989/90 навучальным годзе колькасць студэнтаў складала 169 чалавек, якія прадстаўлялі 51 краіну свету. З іх былі сфарміраваны 22 вучэбныя групы да здачы дзяржаўных экзаменаў

па 5 вучэбных прадметах – руская мова (пісьмова), руская мова (вусна), гісторыя СССР, эканамічная геаграфія СССР, руская і савецкая літаратура. Вучэбны працэс забяспечвалі 44 выкладчыкі, у тым ліку: 3 кандыдаты навук, дацэнты, 1 кандыдат навук, 7 старшых выкладчыкаў, 33 выкладчыкі і асістэнты, а таксама 5 супрацоўнікаў дэканата [11, Арк. 96].

Значны ўклад у паспяховае выкананне задач заключанага года 12-й пяцігодкі на кафедры рускай мовы падрыхтоўчага факультэта для замежных грамадзян забяспечваў калектыў выкладчыкаў на чале з кандыдатам філалагічных навук, дацэнтам З. М. Залуцкай у складзе к.ф.н. дацэнта А. В. Шыдлоўскага, старшых выкладчыкаў С. Б. Варашылавай, Р. М. Ляхновіч, Р. Ш. Арасланавай, А. М. Гуртоўцавай, В. С. Чуевай, У. Р. Галайшы, Г. І. Кліменкі, выкладчыкаў А. М. Сенькевіч, Л. В. Базаравай, С. А. Балонавай, У. У. Гурыновіча, Л. Р. Захаркевіч, І. І. Зябліцава, Л. В. Крэмко, Л. І. Маскалёвай, У. М. Пратасені, Л. А. Рагоўскай, П. В. Сарокі, М. М. Севасцьянавай, С. А. Крапіўнай, Я. Ф. Трысветавай, С. Р. Чаркавасай, А. У. Чыжа, А. С. Шлыка, Т. Б. Мясляковай, З. М. Палішчук, Г. К. Бандарэвіча, Л. Я. Васенковай, М. М. Федаровіча, А. П. Качаргіна, С. П. Кубекі, к.г.н. І. А. Захарчанкі, Ю. А. Абдурахманава, І. П. Сардэчнай, Л. П. Ермалаевай, С. С. Сарвілінай, А. І. Новікавай, Г. Ф. Пастушонак, Н. М. Кабенковай, Н. З. Нарвойша, О. А. Жоса. Першы загадчык кафедры к.ф.н., дацэнт М. П. Кавалёў у гэты час знаходзіўся ў замежнай камандзіроўцы [11, Арк. 73–74].

Такім чынам, першае дзесяцігоддзе свайго існавання калектывам выкладчыкаў кафедры і супрацоўнікаў дэканата, якія забяспечвалі арганізаваную прыёмку кантынгенту навучэнцаў, разам з адміністрацыяй факультэта і інстытута была ўпісана ўнікальная старонка гісторыі ў летапіс Мінскага іняза. Напярэдадні 45-годдзя гэтага факультэта могуць звярнуцца да багатага вопыту, атрыманага супрацоўнікамі дэканата і выкладчыкамі кафедры рускай мовы падрыхтоўчага факультэта для замежных грамадзян Мінскага іняза.

Аўтару гэтых радкоў пашчасціла ведаць асабіста кожнага кіраўніка, выкладчыка і супрацоўніка факультэта, спрычыніцца да шматлікіх пачынанняў, дасягненняў і інавацый у розных сферах жыцця факультэта і кафедры рускай мовы для замежных грамадзян, працуючы на факультэце выкладчыкам гісторыі СССР з 1 верасня 1980 па 1 верасня 1987 г.

## ЛІТАРАТУРА

1. Отчет о работе института в 1979–1980 учебном году году // НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 1. Спр. 984.
2. Отчет о работе кафедры русского языка подготовительного факультета для иностранных граждан за 1980/81 учебный год // НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 1. Спр. 1039.
3. Отчет о работе подготовительного факультета для иностранных граждан за 1980/81 учебный год // НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 1. Спр. 1185.

4. Акт о приемке научно-исследовательской работы «Разработка интенсивных методов обучения русскому языку как иностранному на подготовительном факультете для иностранных учащихся (гуманитарный цикл)» // НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 1. Спр. 1186.
5. Отчет об учебной и политико-воспитательной работе подготовительного факультета для иностранных граждан МГПИИЯ за 1984/85 учебный год // НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 1. Спр. 1273.
6. Протокол совместного заседания кафедры русского языка подготовительного факультета для иностранных граждан и кафедры теории и практики перевода (немецкий язык) МГПИИЯ от 27 февраля 1985 г. // НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 1. Спр. 1289.
7. Отчет о работе кафедры русского языка подготовительного факультета для иностранных граждан МГППИЯ за 1985/86 учебный год // НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 1. Спр. 1344.
8. Отчет о работе кафедры русского языка подготовительного факультета для иностранных граждан МГППИЯ в 1987–1988 учебном году // НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 1. Спр. 1457.
9. Отчет о работе подготовительного факультета для иностранных граждан МГПИИЯ за пять лет его существования (1979–1984 гг.) // НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 1. Спр. 1181.
10. Протокол заседания деканата подготовительного факультета для иностранных граждан МГПИИЯ от 24 декабря 1987 г. // НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 1. Спр. 1457.
11. Отчет о работе кафедры русского языка подготовительного факультета для иностранных граждан МГППИЯ в 1989–1990 учебном году // НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 1. Спр. 1622.

*Поступила в редакцию 27.03.2023*